**ПРАЕКТ**

*зменаў у Кодэкс журналісцкай этыкі ГА "БАЖ", прапанаваны Камісіяй па этыцы (кожны пункт прымаўся па большасці галасоў)*

1. У раздзеле "Прынцыпы пошуку і атрымання інфармацыі" ў артыкуле "*Не павінны публікавацца матэрыялы, атрыманыя шляхам падслухоўвання і далучэння да тэлефоннай размовы*" тэкст замяніць на "*Не павінны публікавацца матэрыялы, атрыманыя шляхам парушэння таямніцы карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў ці іншым неправамерным спосабам*".

2. У раздзеле "Прынцыпы публікацыі" ў артыкуле "*Характарызаваць людзей у матэрыялах СМІ па расавай прыкмеце,веравызнанні, нацыянальнасці…*" тэкст замяніць на "*Згадваць пра расу, веравызнанне і нацыянальнасць чалавека дапушчальна толькі ў тых выпадках, калі гэта мае істотнае значэнне для правільнага разумення публікацыі (сюжэту)*".

3. У раздзеле "Прынцыпы публікацыі" ў артыкуле "*Матэрыялы, перадрукаваныя з іншых сродкаў масавай інфармацыі, павінны мець адпаведныя спасылкі. Нават калі гаворка не вядзецца пра аўтарскае права, крыніцу раней апублікаванай трэцімі асобамі інфармацыі неабходна называць*" сфармуляваць: "*Матэрыялы (тэксты, фотаздымкі, відэа, аўдыё), выкарыстаныя з іншых сродкаў масавай інфармацыі (са спасылкамі ці без іх) не могуць быць "дапрацаванымі" перад публікацыяй – замена загалоўка, перамена ацэнак са станоўчай на нейтральную ці на адмоўную і наадварот (гэтае правіла не тычыцца простых інфармацыйных паведамленняў, якія не абараняюцца аўтарскім правам). Але нават калі гаворка не вядзецца пра аўтарскае права, крыніцу раней апублікаванай трэцімі асобамі інфармацыі неабходна называць – прозвішча аўтара, назва СМІ, нумар газеты ці гіперспасылка на старонку ў анлайне (для анлайн-выданняў)".*

4. Унесці дадатковы пункт аб працы з крыніцамі інфармацыі. *"Паважаць крыніцы інфармацыі".*

5. У раздзеле "Прынцыпы публікацыі" ў артыкуле "*Выкладаючы факты, каментуючы іх і ўступаючы ў палеміку па тых ці іншых пытаннях, журналіст абавязаны прытрымлівацца этыкі і культуры дыялогу, выказваць павагу да чалавека, з якім палемізуе*" дадаць сказ: Камісія лічыць неабходным, што "*выкарыстанне абсцэннай лексікі ў палеміцы ці журналісцкіх каментарах недапушчальнае"* (абсцэнная лексіка (англ. obscene, ад лац. obscenus — агідны, непрыстойны), непрыстойная, нецэнзурная лексіка (у тым ліку мат). У гэты шэраг слоў і выразаў уваходзяць лексіка-фразеалагічныя адзінкі з "пазалітаратурнай" сферы мовы: з прастамоўя, жаргонаў, тэрытарыяльных дыялектаў — http://dic.academic.ru/dic.nsf/es/84217/ОБСЦЕННАЯ).

6. У раздзеле "Прынцыпы пошуку і атрымання інфармацыі" замест "*Нельга ідэнтыфікаваць дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, якія сталі ахвярамі ці сведкамі сексуальных злачынстваў*" напісаць "*Нельга ідэнтыфікаваць асобаў ва ўзросце да 18 гадоў, якія сталі ахвярамі ці сведкамі сексуальных злачынстваў*".